# СУРАЖСКІЯ (ВІЦЕБСКІЯ) ВАРОТЫ

«Суражскія (Віцебскія) вароты», 40-кіламетровы пралом у лініі фронту на стыку нямецка-фашысцкіх груп армій «Поўнач» і «Цэнтр» паміж Веліжам і Усвятамі, які стварыўся ў выніку наступлення савецкай 4-й ударнай арміі Калінінскага фронту ў ходзе Тарапецка-Холмскай аперацыі (09.01–06.02.1942 г.) і вызвалення прыфрантавых раёнаў партызанамі атрадаў М. Ф. Біруліна, М. І. Дзячкова, М. П. Шмырова, Я. З. Захарава. «Суражскія (Віцебскія) вароты» дзейнічалі з 10.02 да 28.09.1942 г. Подступы ўтрымлівалі часці 4-й ударнай арміі і партызанскія брыгады 1-я і 2-я Беларускія. Праз «вароты» партызаны падтрымлівалі кантакты з Віцебскім абкамам КП(б)Б і аблвыканкамам, якія размяшчаліся на тэрыторыі Усвяцкага і Веліжскага раёнаў Смаленскай вобласці, з Паўночна-Заходняй аператыўнай групай ЦК КП(б)Б, камандаваннем 4-й ударнай арміі; у тыл ворага накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, зброя, боепрыпасы, медыкаменты, літаратура; з акупіраванай тэрыторыі выходзілі партызанскія атрады на перафарміраванне, добраахвотнікі, каб уступіць у Чырвоную Армію, насельніцтва, якое ратавалася ад карнікаў (эвакуіравана ў савецкі тыл каля 200 тыс. чалавек – жанчын, старых, дзяцей), ішлі абозы з прадуктамі ў фонд Чырвонай Арміі, у маі–чэрвені 1942 г. партызаны 1-й Беларускай брыгады сабралі і пераправілі ў Савецкі фонд абароны каштоўнасці на 7 млн. руб.

Гітлераўцы неаднойчы спрабавалі ліквідаваць «вароты». У пачатку верасня 1942 г. яны сцягнулі ў гэты раён вялікія сілы пяхоты з артылерыяй і танкамі, у ноч на 25.09.1943 г. пачалі наступаць. Найбольш жорсткія баі партызаны вялі каля в. Пунішча, Пудаць, Булы Суражскага раёна, Дразды, Шмыры, Мялыні Усвяцкага раёна Смаленскай вобласці. Атрад імя Курмялёва суткі трымаў абарону супраць суражскай групоўкі праціўніка каля в. Пунішча, знішчыў каля 300 карнікаў, 2 танкі і толькі з-за недахопу боепрыпасаў адышоў на новыя абарончыя рубяжы. 27 верасня ўвесь дзень ішлі баі ў раёне вёсак Шмыры і Мялыні, і толькі ўначы, пасля інтэнсіўнай арт. падрыхтоўкі, праціўніку ўдалося заняць Мялыні; 28 верасня карнікі занялі Шмыры, Шэршні, Карпекіна і інш. і закрылі «Суражскія (Віцебскія) вароты».

У памяць аб баявых дзеяннях савецкіх воінаў і партызан у в. Заполле Віцебскага раёна быў усталяваны мемарыяльны комплекс «Віцебскія (Суражскія) вароты» (скульптар В. Ягадніцкі).

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Ануфриев, В**. В боях за «Суражские ворота» / В. Ануфриев // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2001. – 7 ліп. – С. 2.

2. **Лукина, Л. В.** Витебские (Суражские) ворота: пример взаимодействия партизан и армии / Л. В. Лукина // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны : зборнік навуковых артыкулаў / склад.: А. А. Крыварот [ і інш.]. – Минск : Беларуская навука, 2015. – С. 142–147.

3. **Паўлавец, П.** «Суражскія вароты» / П. Паўлавец // Ленінская іскра (Сянно). – 1974. – 14 сак. – С. 2.

4. **Погорелов, А. А.** У «Суражских ворот» / А. А. Погорелов ; лит. обраб. К. Папковского. – Минск : Беларусь, 1980. – 191 с.

5. **Хаўратовіч, І. П.** Віцебскія «вароты» / І. П. Хаўратовіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 134.